**ПАДЗЕЯ**

# «КУПАЛЬСКІЯ ЗОРЫ» НАД НЁМАНАМ

**21 красавіка 2023 года ў зале Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці адбыўся чарговы этап праекта Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі пад назвай «Абласны літаратурны Рэгіён-фэст». Перад калегамі і аматарамі літаратуры з горада над Нёманам выступіў калектыў літаратурнага аб'яднання «Купальскія зоры» з горада Баранавічы.**



І выступіў, трэба прызнаць, бліскуча. Чаму ў літаратурным праекце Гродзеншчыны прымае ўдзел літаб'яднанне з Брэсцкай вобласці, патлумачыла старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Антонаўна Кебіч *(на фота)*: «Справа ў тым, што літаратурным аб'яднаннем «Купальскія зоры» пры Цэнтральнай бібліятэцы горада Баранавічы імя Валянціна Таўлая кіруе паэтэса, член СПБ, педагог-філолаг Таццяна Мікалаеўна Яцук, якая нарадзілася на Навагрудчыне. Так склалася, што свой лёс жанчына звязала з горадам Баранавічы, але ж сувязяў з Гродзеншчынай не губляе, з'яўляецца членам Гродзенскай абласной пісьменніцкай арганізацыі. Таму ўдзел у нашым Літаратурным Рэгіён-фэсце літаб'яднання з Баранавіч бачыцца нам лагічным».



Пра гісторыю і жыццё літаратурнага аб'яднання распавяла яго кіраўнік Таццяна Мікалаеўна Яцук *(на здымку)*: «Купальскія зоры» – на сённяшні дзень гэта пятнаццаць аўтараў. Мы пішам вершы, прозу, песні і нават спрабуем сябе ў драматургіі. Большасць аўтараў карыстаецца роднай, беларускай мовай. Актыўна ўдзельнічаем у літаратурным жыцці краіны. Напрыклад, удзельнічалі ў праграме Дня беларускага

пісьменства, які праходзіў у 2019 годзе ў Слоніме. Нашай товрчай суполкай выдаецца літаратурны альманах, які таксама мае назву «Купальскія зоры». Сёлета літаратурнае аб’яднанне будзе адзначаць сваё 5-годдзе. Таму зразумела, што мы знаходзімся на пачатку свайго творчага шляху». Таццяна Мікалаеўна прадставіла і лаканічна ахарактарызавала творчае амплуа кожнага ўдзельніка прэзентацыі. Тыя, хто не прыйшоў на мерапрыемства, страцілі вельмі шмат, таму што праграма гасцей на палову складалася з песень. Аўтарам тэкстаў да большасці з іх з'яўляецца Таццяна Яцук.

Удзел літаратараў з горада Баранавічы ў фестывалі рэгіянальнай літаратуры ператварыўся ў яркае баляванне мастацкасці традыцый, тонкага густу, высокай грамадзянскасці. Госці прадэманстравалі надзвычай высокі творчы ўзровень і стварылі вельмі цёплую, сяброўскую атмасферу ў зале. Такім чынам, знаёмцеся, у гэты красавіцкі дзень на Гродзенскай сцэне выступілі: паэтэса Таццяна Яцук; спявачка Галіна Бабонава; паэт Юрась Мазалевіч; паэтэса, аўтар і выканаўца песень Ірына Мезенцава; паэтэса Наталля Несцярук; спявачка Рэгіна Скіпар; празаік Таццяна Смаляк; драматург, паэт-артыст Міхаіл Стрыжоў; паэт Аляксей Белы.
















Кожны з выступоўцаў стараўся акрэсліць сваю сувязь з Гродзеншчынай, і гэта дапамагло высветліць – як многае нас, сапраўды, звязвае ў жыцці. Нават паэт Валянцін Таўлай (1914-1947), якога на Гродзеншчыне лічаць сваім, нарадзіўся ў Баранавічах… Прагучалі песні, вершы і проза на беларускай і рускай мовах. Выступленні гасцей падарылі слухачам незабыўныя эмоцыі. У фінале прэзентацыі са сваімі ўражаннямі ад яе, з падзякай калектыву літаб’яднання выступілі: кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, член СПБ, літаратурны крытык, паэтэса Аліна Сабуць; кіраўнік Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая; член Слонімскага раённага літаб'яднання імя Анатоля Іверса, паэтэса Алена Руж. А Людміла Антонаўна Кебіч уручыла творчаму калектыву з горада Баранавічы дыплом Ганаровага партнёра Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Гэта значыць, што сяброўства і супрацоўніцтва аднадумцаў і калег з суседніх рэгіёнаў толькі пачынаюцца. У хуткім часе з'явіцца відэафільм «"Купальскія зоры" над Нёманам». З недахопаў

мерапрыемства: на жаль, яно прайшло практычна ў на палову пустой зале; па нявысветленых прычынах з 8 запрошаных устаноў адукацыі Гродна запрашэнне прыняла толькі адна. Таксама выклікае шкадаванне нізкая цікавасць да мерапрыемства з боку ГрАА СПБ. Але жыццё працягваецца, і мы жадаем калегам з горада Баранавічы, гэтым светлым, адораным творчым людзям, здароўя і натхнення, далейшага творчага развіцця і максімальнай рэалізацыі. Так трымаць, «Купальскія зоры»! Да наступных сустрэч!

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**
Фота **Анатоля Апанасевіча**












ВЕТКІ У СТАГАХ
"ТАКАЯ КАК ЕСТЬ"
Автор и исполнитель Ирина Мезенцева
ЛИСТОПАД ВПЕРЕМЕЖКУ С ДОЖДЁМ
НЕВОЛЬНИЧЬИ ПЕСНИ
АЛЕКСЕЙ БЕЛЫЙ
АЛЯКСЕЙ БЕЛЫ
ЖЫВІ, ДЗЕ ЎДОСТАЛЬ ВЕТРУ...
Ирина
Мезенцева
И на снегу расцветают розы







